**Т.М. Ігнацюк**
Брэст, УА «БрДТУ»

## АФАРЫСТЫКА І КАТЭГОРЫЯ ПАФАСУ

Нягледзячы на тое, што існуе шмат літаратуры, прысвечанай афарыстыцы [4; 8], афарызм як жанр славеснай творчасці (мала-фарматны тып тэксту) даследаваны недастаткова. Паняцце афарызму, яго трактоўка і ўспрыманне залежаць ад культурна-гістарычнага фону і навуковага кантэксту, а таксама ад лінгвакультурнай традыцыі і пазіцыі даследчыка.

У энцыклапедыях, даведніках і тэарэтычных даследаваннях можна сустрэць шматлікія азначэнні феномену афарызма, якія адрозніваюцца не толькі ў асобных дэталях, але і сваімі істотнымі прыметамі. Параўнаем найбольш паказальныя дэфініцыі: афарызм – гэта «кароткае выразнае выслоўе, якое змяшчае абагульняючае выснову; крылатая фраза» [2, с. 313]; «абагульненая, завершаная глыбокая думка пэўнага аўтара, выяўленая ў лаканічнай форме, якая адрозніваецца выразнасцю і нечаканасцю меркаванняў. Як і прыказка, афарызм не даказвае, не аргументуе, а ўздзейнічае на свядомасць арыгінальнай фармулёўкай думкі» [1, с. 434]; «меркаванне агульнага характару, якое выказана ў лаканічнай мастацкай форме і, як правіла, належыць пэўнаму аўтару» [7, с. 57]; «афарызмы – кароткія павучальныя выслоўі» [6, с. 36].

З прыведзеных азначэнняў вынікае, што афарызмамі прынята называць кароткія, глыбокія па змесцу і закончаныя з пункту гледжання сэнсу меркаванні, якія належаць пэўнаму аўтару і звычайна маюць вобразную, лёгка запамінальную форму.

Гэты выдатны жанр інтэлектуальнага мастацтва забяспечыў сабе дзіўнае даўгалецце і вялікую папулярнасць у народзе. Яго шанавалі вядомыя людзі ўсіх эпох і часоў. «Моцныя, кароткія выразы шмат садзейнічалі паляпшэнню жыцця», – казаў Цыцэрон. «Афарызм, нібы жэмчуг, бліскае зместам. Сапраўдная мудрасць нешматслоўная», – сцвярджаў Л.М. Талстой. Сапраўдным прыхільнікам афарыстыкі быў

М. Горкі. Афарыстычная творчасць выклікала цікавасць і ў заснавальнікаў навуковага камунізму К. Маркса і Ф. Энгельса. У.І. Ленін па-майстэрску выкарыстоўваў афарызмы ў сваіх працах, а таксама ў публічных прамовах.

З самых старажытных часоў афарызмы суправаджалі чалавека, сінтэтычна абагульняючы мудрасць народа. Адлюстоўваючы народныя інтарэсы і спадзяванні, афарызмы з'яўляліся своеасаблівым увасабленнем грамадскай думкі. Тэматыка афарызмаў вельмі разнастайная; яна нясе на сабе адбітак эпохі, якая іх спарадзіла, адлюстроўвае характар гістарычных умоў, у якіх яны ўзнікалі. Часта афарызм трактуе этычныя праблемы або тычыцца бытавых сітуацый, ахопліваючы пры гэтым ўсе сферы чалавечага жыцця.

Афарызм – феномен кагнітыўны. Чалавек мысліць афарызмамі. У афарыстыцы знаходзіць увасабленне мудрасць пакаленняў. Аднак кагнітыўны аспект афарыстыкі даволі часта не вытрымліваецца, і афарызмы набываюць пафаснае грамадскае гучанне. Так, афарызм Шамфора «*Мір халупам! Вайна палацам!*» натхняў і накіроўваў на барацьбу шырокія народныя масы ў перыяд Французскай рэвалюцыі. У часы грамадскіх пераўтварэнняў афарызмы станавіліся баявымі лозунгамі, натхнялі заняволеныя народы на барацьбу супраць прыгнятальнікаў.

Сталі сусветна вядомымі словы Маніфеста камуністычнай партыі: «*Прывід блукае па Еўропе – прывід камунізму!*». «*Пралетарыі ўсіх краін яднайцеся!*» Старажытнае евангельскае выслоўе «*Хто не працуе, той не есць*» на працягу вядомага гістарычнага перыяду было найважнейшым правілам сацыялістычнага грамадства.

Афарызмы заўсёды прыцягвалі ўвагу людзей таму, што ў сілу сваёй універсальнасці і трапнасці яны адпавядалі духу эпохі, якая іх спарадзіла; афарызмы аднолькава блізкія як да навукі, так і да мастацтва; у іх арганічна спалучаюцца прынцыпы навуковай і мастацкай творчасці. Паказальны той факт, што многія выдатныя вучоныя з'яўляліся адначасова і стваральнікамі афарызмаў. Можна ўзгадаць старажытнага вучонага родапачынальніка афарыстыкі Гіпакрата, назваць такіх аўтараў афарыстычных выслоўяў і цэлых кніг афарызмаў, як Паскаль, Гёте, Ліхтэнбэрг; яны былі таксама і выдатнымі вучонымі свайго часу.

Даволі часта ў сваёй гісторыі людзі сутыкаліся з тым, што права на свабоду і незалежнасць ім прыходзілася заваёўваць з дапамогай зброі. Гісторыя захавала імёны таленавітых стратэгаў, чый розум і халодны разлік вызначалі ход вялікіх бітваў і перамог. У выказваннях самых вядомых у сусветнай гісторыі палкаводцаў, чыя мова была вастрэй зброі, можна сустрэць афарызмы, у якіх увасабляецца пафасны патэнцыял.

Да нас дайшлі афарызмы вялікіх палкаводцаў і дзеячаў, якія сведчаць аб іх мудрасці, ваенным майстэрстве і патрыятызме. Яны ўжывалі мову не

толькі для таго, каб аддаць загад, але і для таго, каб вымавіць у належны час неабходныя словы. Сувораў: «*Хуткасць і націск – душа сапраўднай вайны*»; Напалеон: «*Рэвалюцыя – гэта перакананне, падмацаванае штыкамі*», «*Правадыр падобны гандляру, які ўклаў свае сродкі ў справу і які чакае прыбытку*»; Аляксандр Македонскі: «*Не можа быць двух сонцаў на небе і двух уладароў на зямлі*», «*Няма нічога больш рабскага, чым раскоша і пяшчота, і нічога больш царскага, чым праца*»; Цэзар: «*Найвялікшы вораг хаваецца там, дзе вы будзеце менш за ўсё яго шукаць*», «*Падзяляй і пануй*», «*Прыйшоў, убачыў, перамог*».

Шмат афарызмаў засталося пасля нямецкага палкаводца Ото Бісмарка: «*Усе мы – народ, і ўрад – таксама*», «*Свабода – гэта раскоша, якую не кожны можа сабе дазволіць*», «*Нават пераможная вайна – гэта зло, якое павінна быць папярэджана мудрасцю народаў*», «*Вялікія пытанні часу вырашаюцца не прамовамі і рэзалюцыямі большасці, а жалезам і крывёй*», «*Рэвалюцыю падрыхтоўваюць геніі, ажыццяўляюць фанатыкі, а пладамі яе карыстаюцца прайдзісветы*»; і амерыканскага прэзідэнта Джорджа Вашынгтона: «*Без свабоды слова нас можна весці нямымі і ціхімі, як авечак на забой*», «*Дысцыпліна – душа арміі. Яна ператварае нешматлікае войска ў магутную сілу, прыносіць поспех слабым і павагу ўсім*», «*Дарога да славы ў патрыятычнай арміі і свабоднай краіне адкрыта ўсім*».

Для стварэння афарызмаў патрабуюцца ясны розум мысліцеля і гарачы тэмперамент мастака, логіка вучонага і валоданне формай, уласцівае пісьменніку, але перш за ўсё чалавечая перакананасць, духоўнае падзвіжніцтва і здольнасць да адкрыцця [9, с. 133].

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Большая Советская Энциклопедия : в 30 т. / гл. ред. А. М. Топоров. – 3-е изд. – Т. 2. – М. : Совет. энцикл., 1970.

2. Большой академический словарь русского языка. Т. 1. – М. – СПб. : Наука, 2004.

3. Брокгауз, Ф. А. Энциклопедический словарь. Современная версия / Ф. А. Брокгауз, И. А. Ефрон. – М. : Эксмо, 2003.

4. Манякина, Т. И. Языково-стилистическая характеристика жанра афоризмов (на материале немецкого языка) : дис. … канд. филол. наук / Т. И. Манякина. – Днепропетровск, 1980.

5. Мележ, Іван. Подых навальніцы : раман з «Палескай хронікі» / Іван Мележ. – Мінск : Маст. літ., 2003.

6. Мележ, Іван. Завеі, снежань : раман з «Палескай хронікі» / Іван Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1992.

7. Никитина, С. Е. Экспериментальный системный толковый словарь стилистических терминов / С. Е. Никитина. – М. : Ин-т языкознания РАН, 1996.

8. Федоренко, Н. Т. Меткость слова: (афористика как жанр словесного искусства) / Н. Т. Федоренко. – М. : Современник, 1975.

9. Wehe, W. Geist und Form des deutschen Aphorismus / W. Wehe // Der Aphorismus: zur Geschichte, zuden Formen und Moglichkeiten einer literarischen Gattung / Hrsg. vonG. Neumann (Wege der Forschung; Bd. 356). – Darmstadt : Wissenschaftliche Buchgesellschaft, 1976.

Oer